УЧРЕЖДЕНИЯ ОБРАЗОВАНИЯ
«ПИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ БАНКОВСКИЙ КОЛЛЕДЖ
НАЦИОНАЛЬНОГО БАНКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ»

«БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЭКОНОМИЧЕСКИЙ
УНИВЕРСИТЕТ»

**ТЕЗИСЫ ДОКЛАДОВ НАУЧНО-ТЕОРЕТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ ПОСВЯЩЕННОЙ 60-ЛЕТИЮ ПОБЕДЫ В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ**



# ПОБЕДА В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ - ВЕЛИЧАЙШЕЕ СОБЫТИЕ XX ВЕКА

ПИНСК 2005

УЧРЕЖДЕНИЯ ОБРАЗОВАНИЯ
«ПИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ БАНКОВСКИЙ КОЛЛЕДЖ НАЦИОНАЛЬНОГО БАНКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ»

«БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЭКОНОМИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# ТЕЗИСЫ ДОКЛАДОВ НАУЧНО-ТЕОРЕТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ ПОСВЯЩЕННОЙ 60-ЛЕТИЮ ПОБЕДЫ В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ

Материалы печатаются в основном в том виде, в котором они были представлены авторами. Только в некоторых случаях они сокращены или подредактированы - там, где это было особенно необходимо.

Материалы печатаются по решению кафедры социально-гуманитарных дисциплин. Протокол. № 9 от 28.04.2005г.

*Ответственный за выпуск* **М.В. Цуба**

# СТВАРЭННЕ ПЕРШАГА ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ

**М.В. Цуба**

Партызанскі рух не з'яўляецца толькі нацыянальнай беларускай з'явай. Аднак, гісторыя не ведала стварэння такой масавай колькасці партызанскіх атрадаў, як гэта адбылося на беларускіх землях у гады Вялікай Айчыннай вайны. Канстатуючы гэты факт, мы павінны ў першую чаргу звярнуцца да вытокаў партызанскага руху, якія непасрэдна звязаны з пінскім краем.

Раніцай 22 чэрвеня 1941 года, па ўспамінах В.З.Каржа, за ім прыехала абкомаўская машына, і шафёр паведаміў аб пачатку вайны. "У мяне адразу спрацавала думка: што рабіць? Патрэбна ствараць партызанскія атрады і паднімаць народ на барацьбу. Мабілізацыю Германія нам сарве. Утрымаць абстралянага ворага пры раптоўным нападзе цяжка, - так адрэагаваў на гэту страшную вестку Васіль Корж, які працаваў у гэты час загадчыкам гаспадарча-фінансавага сектара ў Пінскім абкаме КПБ(б). Тут жа разважанні Каржа былі падмацаваны падышоўшымі сябрамі-суседзямі Р.С.Карасёвым і Ф.С.Куньковым, якія разам з ім партызанілі ў 20-я гады на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У кнізе "Усё жыццё Айчыне" чытаем: "Зноў пойдзем ваяваць, партызаніць створым атрад, - цвёрда сказаў Карасёў. - Задума Рыгора Сцяпанавіча, мабыць правільныя. Я да яе далучаюся. Патрэбна будзе сказаць аб гэтым Мінчанку. Як ён аднясецца? А табе, Грыша, дакладней вам дваім, трэба ўжо шукаць добраахвотнікаў для атрада. Можна і беспартыйных, але адданых Радзіме людзей. Толькі панікёраў не бярыце", дадаў Васіль Захаравіч. Пасля чаго Корж звярнуўся з дадзенай прапановай да першага сакратара Пінскага абкама А.М.Мінчанкі. Аб гэтым у дзённіку В.З.Каржа запісана наступнае: "У пакоі Мінчанкі сядзеў другі сакратар абкама тав. Шапавалаў. Пасля таго, як Мінчанка скончыў даваць распараджэнні, я папрасіў іх абодвух выслухаць мае намеры і планы па стварэнню партызанскіх атрадаў. У іх

атрымалася маленькая замінка. Я гэта бачыў. Таму што не было зверху наконт гэтага ўказання". Вядома, што за такую самадзейнасць магло пагражаць у той час. У выніку быў знойдзены кампрамісны варыянт. Мінчанка даў дазвол Каржу фарміраваць атрад, але забараніў называць яго партызанскім, бо ў адпаведнасці з дактрынай Сталіна ваяваць збіраліся толькі на зямлі ворага.

Ужо вечарам 22 чэрвеня 1941 года на Паштовай вуліцы (сёння завулак вуліц Каржа і Заслонава) у будынку абкама камсамола сабралася 60 чалавек. Сярод іх былі Рыгор Карасёў, Сяргей Карнілаў, Вера Харужая, Фёдар Куньтоў, Іван Чуклай, Эдуард Нордман, Уладзімір Марозаў, Шаі Беркавіч, Міхаіл Ласута, Аляксандр Салохін, Віктар Ліфанц'еў, Іван Буйніцкі і іншыя. Тут жа камандзірам атрада В.З.Каржом ім былі выдадзены прывезеныя з ваенкамата трохлінейкі старога ўзору, якія ўжо былі спісаны з узбраення, ручныя гранаты і патроны. Нічога лепшага з узбраення знайсці не ўдалося. Атраду была пастаўлена задача ажыццяўляць ахову вакзала, друкарні, ТЭЦ і весці разведку на блізляжачых дарогах да Пінска.

Такім чынам, першапачатковая задума, звязаная з перабазіраваннем так званага "знішчальнага атрада Каржа" ў раёны, акупіраваныя немцамі, адпала сама-сабой ў сувязі з хуткім прасоўваннем фашысцкіх войск па нашай тэрыторыі. І ў гэтых абставінах атрад прыступіў да абароны Пінска.

Ёсць пэўныя звесткі, што быццам бы 24 і 26 чэрвеня байцамі атрада былі затрыманы каля Пінска нямецкія дэсантнікі. Але аб гэтым ў запісах Каржа нічога не пазначана. Ён піша, што ў першыя дні вайны ў горадзе была паніка, "...хадзілі ўсемагчымыя чуткі. Хтосці распавядаў, што немцы ўжо занялі цэнтр горада. Байцам з атрада прыходзілася матацца па ўсяму гораду, высвятляць, удакладняць. Было ўстаноўлена, што немцаў ні ў горадзе, ні ў ваколіцах няма." Яшчэ больш жару дадавалі бежанцы, якія расказвалі аб зверствах фашыстаў і аб іх узбраенні.

Такая абстаноўка і вырашаемыя атрадам задачы патрабавалі хуткага рэагавання. З гэтай мэтай В.З.Корж падзяліў атрад на тры групы. Першую групу ўзначаліў сам Корж, камандзірам 2-й групы быў прызначаны Р.С.Карасёў і трэццюю ўзначаліў С.Г.Карнілаў.

Тым часам у штаб абароны горада паступалі ўсё больш трывожныя весткі: фашысты занялі Драгічын, Іванава, Лагішын. Галоўным напрамкам наступлення германскіх войск было цэнтральнае - на Мінск. 27 чэрвеня Мінск быў захоплены. Улічваючы гэтыя абставіны, самым небяспечным для Пінска з'яўляўся паўночны напрамак па шляху Лагішын-Пінск. Менавіта сюды 28 чэрвеня па загаду Каржа была накіравана 2-я група на чале з самым вопытным партызанам, прайшоўшым з В.З.Каржом усю грамадзянскую вайну, з тым, на каго Корж мог найбольш спадзявацца - Рыгорам Карасёвым. Парада на дарогу, дадзеная Каржом, была кароткай: "Справа, на якую мы пайшлі, незвычайная. Будзе цяжка. Галоўнае не баяцца, а навучыцца дзейнічаць супраць фашыстаў смела і рашуча. Вось

ваш камандзір, - Корж паказаў на Карасёва, - сто раз смерці ў вочы глядзеў, не адзін дзесятак ворагаў на той свет адправіў, а сам жывы і бадзёра па зямлі ходзіць. Раўняйцеся на яго". З самай раніцы група Карасёва заняла зручныя пазіцыі для бою каля вёскі Падбалоцце, што 12 км. ад Пінска. У хуткім часе пачуўся роў прыбліжаючыхся нямецкіх танкаў. 20 байцоў атрада, якія добра замаскіраваліся паабапал дарогі, па камандзе Карасёва павінны былі прапусціць галоўны танк да залёгшага непадалёку інструктара Пінскага гаркама Салохіна, які чакаў яго са звязкай ручных гранат. Па астатніх танках Карасёў аддаў загад адкрыць інтэнсіўны агонь пасля яго першага выстрала. Па ўспамінах Р.С.Карасёва: "...танкі прыбліжаліся нетаропка, фашысты былі перакананы ў сваіх сілах, ведаючы, што за імі стаіць амаль уся ўзброеная і заваяваная Еўропа. Але з байцоў ніхто не думаў тады, як небяспечна ўступаць у бой з аднымі вінтоўкамі і гранатамі, якіх была малая колькасць з узброеным да зубоў ворагам." І вось калона зусім побач, параўноўваецца з затаіўшыміся ў засадзе партызанамі - першы танк, затым другі і тут гучыць даўгачаканы выстрал камандзіра групы. Амаль адначасова закруціўся на адной гусеніцы і спыніўся галоўны танк пасля кідка гранат Салохіна. І тут жа задыміўся пасля трапных партызанскіх выстралаў другі танк, які павярнуў назад, пакідаючы за сабой шлейф дыму. За ім павярнулі астатнія, пакінуўшы на волю лёсу першы танк. Перамога. Партызаны імгненна акружылі падбіты танк, выцягнулі з яго перапужаных фашысцкіх ваяк, знялі буйнакаліберны кулямёт, рацыю, забралі патроны, карту, дакументы, а танк падпалілі. Як успамінаў затым Р.С.Карасёў і пазначыў у сваім запісе В.З.Корж: "Усё гэта было зроблена так хутка, быццам бы яшчэ не абстраляныя байцы групы толькі і займаліся ўсё жыццё тым, што знішчалі нямецкія танкі". Вось так адбылася першая сутычка з ворагам і здабыта першая партызанская перамога.

У сувязі з тым, што менавіта 28 чэрвеня 1941 года атрад атрымаў першае баявое хрышчэнне, то і было прынята, у пасляваенны час, лічыць гэтую дату днём стварэння партызанскага атрада, а не вечар 22 чэрвеня, калі фактычна атрад ужо быў сфарміраваны.

Вестка аб тым, што фашысты не такія ўжо і непераможныя і што іх можна біць нават у іхніх жа танках, абляцела ўвесь горад. Дзякуючы гэтай перамозе наступ фашыстаў на Пінск на некалькі дзён замарудзіўся, што дазволіла ў значнай меры арганізавана ажыццявіць эвакуацыю.

Прыкрываючы ўсё той жа - паўночны, самы небяспечны напрамак на подступах да Пінска, Васіль Корж разлічваў абстраляць ворага, спыніць яго хаця б на нейкі тэрмін, каб выйграць час для выезду апошніх эвакуацыйных машын па дарозе з Пінска на Столін. З гэтай мэтай 4 ліпеня 1941 года была арганізавана сіламі ўсяго атрада чарговая засада на тым жа шляху Лагішын-Пінск. Першая і другая групы занялі пазіцыі ў былым фальварку Заполле, на могілках і на шляху, трэцяя група размясцілася ў паўночна-заходняй частцы вёскі Галева.

Былі падабраны самыя зручныя месцы для абстрэлу, абсталяваны акопы, выдзелены патрулі на дарогах. Перад боем Корж, падбадзёрыўшы байцоў, параіў: "Самае галоўнае для нас - гэта вытрымка і нечаканасць. Падпусцім ворага бліжэй, нанясём нечаканы ўдар, гэтым пасеем у іх шэрагах паніку. А гэта ўжо палова перамогі".

Прыкладна каля 10-ці гадзін раніцы патрульныя паведамілі аб з'яўленні нямецкай кавалерыі. Далей, як развіваліся падзеі гэтага бою чытаем з занатаваных В.З.Каржом успамінаў: "Я даў загад прыгатавацца да бою. Тоўстыя ліпы з навісшымі кронамі дазвалялі партызанам добра схавацца ад вачэй праціўніка... Дарога, па якой рухаліся фашысты, была ад нас не болей чым сто метраў. Я прапусціў галоўную ахову, яе сустрэне сваім агнём трэццяя група на чале з Карнілавым. Пачакаў, пакуль кавалерысты параўняюцца з намі, "пасадзіў" на мушку тоўстага, з загарэлым тварам афіцэра. Праз аптычны прыбор маёй вінтоўкі ён быў добра бачны. Націскаючы на спускавы кручок, ведаў, што не прамахнуся. Прагрымеў выстрал. Адразу адкрылі агонь усе байцы. Кожны загадзя выбраў сабе мішэнь. Гэта былі самыя трапныя, самыя паспяховыя выстралы. Не менш, 20 фашыстаў былі адразу паражоныя напавал. У шэрагах ворага паніка. Становішча выправіў падаспелы на дапамогу яшчэ адзін фашысцкі эскадрон кавалерыі і група немцаў, якая рухалася па шляху Брэст-Пінск. Засакаталі кулямёты і аўтаматы, агонь па нашых пазіцыях узмацніўся". В.З.Корж разумеў, што з іх трохлінейкамі доўга не ўстаяць супраць добра ўзброенага ворага. Да таго ж былі страты: загінуў у баі камандзір трэцяй групы С.Г.Карнілаў, некалькі чалавек атрымалі раненні. З мінулага вопыту Корж добра ведаў, што для народных мсціцаў разам з нечаканым нападам на ворага, важнае значэнне маюць хуткі адыход, змена пазіцыі, манеўраванне. У гэтым сіла партызанскай вайны. Пасля некаторага роздуму, ён аддаў загад адыходзіць і пакідаць Пінск, каб сюды вярнуцца ў ліпені 1944 года. Яшчэ раз даказаўшы, што сапраўдных герояў вядуць да славы не толькі перамогі, але і паражэнні.

За гэты час з маленькага атрада (60 чалавек) В.З.Корж стварыў магутнае партызанскае злучэнне, якое налічвала больш 15-ці тысяч байцоў. За гады вайны партызаны Піншчыны знішчылі 26616 фашыстаў, разграмілі 60 буйных нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў, пусцілі пад адкос 468 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага і г.д.

За гэтымі статыстычнымі лічбамі для В.З.Каржа стаяць больш чым тры гады ўпартай, беспрапыннай барацьбы з фашызмам, рызыкоўныя баявыя аперацыі з асабістым удзелам, блакады, прарывы, жыццё ў лясах і балотах.

Але ўсё гэта было пасля. Першае, яно заўсёды першае, як палёт Гагарына ў космас. Аб чым нам напамінае пастаўленая непадалёку ад Пінска ўдзячнымі нашчадкамі стэла. Менавіта тут болей за 60 гадоў таму назад прагучалі першыя партызанскія выстралы, якія абвясцілі аб пачатку партызанскай вайны. Гэтае месца безумоўна не так вядомае, як Сталінград, Курская Дуга, - перамога тут мела часовы і частковы характар. Аднак, калі

грунтавацца на дакладнасці гістарычных фактаў, то патрэбна прызнаць, што менавіта тут быў створаны першы партызанскі атрад не толькі на Беларусі, але і ў Вялікай Айчыннай вайне. Тут быў дадзены першы партызанскі бой, тут была атрымана першая партызанская перамога.

Прыемна адзначыць, што на чале ўсяго гэтага першага стаялі нашы землякі - В.З.Корж і Р.С.Карасёў.

СОДЕРЖАНИЕ


*Макарушко В.В.* «Не ради громкой славы» 3

*Казакевич А.А.* Международное положение накануне Второй Мировой войны 6

*Федечко С.А.* WEB-ресурсы по истории Великой Отечественной и Второй Мировой войн 10

*Кузнецова В.С.* Роль прессы в годы Великой Отечественной войны 13

*Колесник И.Н.* Трагические последствия Великой Отечественной войны для жителей города Пинска 16

*Можейко П.П.* Вклад Христианской Церкви в победу над фашизмом 21

*Цуба М.В.*Стварэнне першага партызанскага атрада ў Вялікай Айчыннай вайне 26

*Ключенкова Е.Н.* Страница из жизни В.З. Коржа 30

*Гичун Д.И.* Белорусская школа подготовки партизанских кадров при БШПД (в/ч 00133) в 1942-1943гг 32

*Лира Е.С., Басевич М.В* Днепровская военная флотилия в Великой Отечественной войне 34

*Шнякин В.В.* Советско-финская война (1939-1940гг) 43

*Коминский Ю.А.* Коренной перелом в Великой Отечественной войне... 47

*Гагуа Р.Б* Сражение при Грюнвальде в историографии времен Второй Мировой войны 49

*Галковский В.Ф.* Маршал, который всегда побеждал 52

*ФедечкоС.А., Полховская И.В.* Немецкое население и советская армия 57

*Арсентьев А.В., Гориш И.В.* Пинская тюрьма в годы Великой Отечественной войны 61

*Геронтьева Е.А.* Колокола Хатыни 69

Научное издание

# ПОБЕДА В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ - ВЕЛИЧАЙШЕЕ СОБЫТИЕ XX ВЕКА

**Тезисы докладов**
**научно-теоретической конференции**
**посвященной 60-летию победы**
**в великой отечественной войне**

Пинск, 4 мая 2004г.

Редактор П.С.Кравцов
Корректор П.С.Кравцов
Компьютерный дизайн П.С.Кравцов

Подписано в печать 28.05.2005 Усл. печ. л. 3,8. Уч.-изд. л. 3,1.
Тираж 30 экз.
Отпечатано на ризографе
Учреждение образования «Пинский государственный высший банковский колледж Национального банка Республики Беларусь»
225710, Пинск, ул. Днепровской Флотилии, 23